*Жанна СЕЛЮЖЫЦКАЯ*

# НАМІНАЦЫІ ЧЫНОЎ БЕЛАРУСКАГА ВЯСЕЛЛЯ Ў АРЭАЛЬНЫМ АСПЕКЦЕ

Выкарыстаныя намі крыніцы (этнаграфічныя апісанні беларускага вяселля, беларускія дыялектныя слоўнікі і дыялекталагічныя зборнікі, слоўнік палескіх вясельных чыноў А.В. Гуры) не дазваляюць вызначыць цалкам ізалексы пашырэння назваў вясельных чыноў, паколькі тэрыторыя даследавана нераўнамерна. Аднак на падставе аналізу наяўных намінацый сярод іх вылучаюцца некаторыя дыялектна-тэрытарыяльныя групы.

Частка намінацый з тэрмінасістэмы вясельных чыноў пашыраная на ўсёй тэрыторыі Беларусі, г. зн., у той ці іншай ступені такія назвы выступаюць у лексічнай сістэме ўсіх беларускіх народных гаворак. Да ліку агульнавядомых тэрмінаў належаць: *сват* 'жанаты мужчына, які сватае хлопцу нявесту'; жанаты мужчына з боку маладой або маладога; кіраўнік вяселля', *сваха* і *свацця* 'замужняя жанчына з боку маладой або маладога', *маладьі*, *маладая*, *маладыя*, *засватаная* і *заручаная* 'дзяўчына пасля заручын і да ўласна вяселля', *шафер* 'нежанаты брат або сябар маладога'. Агульнавядомымі з'яўляюцца таксама назвы *прыданыя* і *прыданкі*, але ў гаворках яны выступаюць з рознай семантыкай.

Выдзяляецца група лексем, якія ўжываюцца на ўсёй тэрыторыі Беларусі, за выключэннем некаторых рэгіёнаў. Гэта намінацыі *нявеста* 'дзяўчына перад вяселлем', *дружка* і *дружок* 'кіраўнік вяселля' (не характэрны Гродзенскай вобласці), *маршалак* 'кіраўнік вяселля' (не характэрна Усходняму Палессю), *дружка* і *дружок* 'нежанаты брат (сябар) маладога' (не характэрна Магілёўскай вобласці), *брат* 'нежанаты брат маладой', *дружка* 'незамужняя сястра або сяброўка маладой', каравайніцы 'удзельніцы абраду прыгатавання каравая' (не характэрны Віцебскай вобласці), *вясельнікі* 'удзельнікі вяселля' (не характэрны Віцебскай і Магілёўскай вобласці).

Намінацыі, ужыванне якіх абмежаванае больш вузкімі арэаламі, дазваляюць вылучыць некаторыя групоўкі. Па некалькіх лексемах (не менш за дзве) выдзяляюцца наступныя арэалы.

Полацка-віцебскі арэал акрэсліваюць тэрміналагічныя адзінкі *баярка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *надкоснік* 'нежанаты брат маладой', *кубельнік* 'асоба, што перавозіць кубел маладой у дом маладога', *наменік* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *тоўсты сват* 'кіраўнік вяселля'. Гэты арэал адпавядае вылучанай у папярэдніх працах паўночнай групе гаворак

[2, карта №74]. Ён супадае таксама з гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам Падзвінне [3: 152].

Ашмянска-полацка-віцебскі арэал вылучаецца на аснове лексем з коранем -кос- для абазначэння нежанатага брата маладой (*закоснік, падкоснік, надкоснік* і інш.) і нежанатага брата (сябра) маладога (*пакоснік, закоснік*), а таксама назваў *бальшанка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *баярка* 'тс'. Ён пашыраецца і на Барысаў. Аднак не ўсе з гэтых лексем выступаюць сёння ў мясцовых гаворках. Прынамсі, тэрмін *бальшанка* адзначаны ў Віцебскай вобласці толькі ў песнях. Таксама толькі ў песнях на Панямонні і Міншчыне мае месца намінацыя *баярка*. Адзначаны арэал суадносіцца з выдзеленымі раней пружанска-слуцка-аршанскім і свірска-лепельска-віцебскім пучкамі ізаглос [2: №36, №54].

Віцебска-барысаўскімі ў адносінах тэрыторыі пашырэння з'яўляюцца тэрміны *сняданка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *вячэрнік* 'нежанаты брат маладой', *вячэрнікі* 'вячэрні поезд гасцей нявесты ў дом жаніха', *перазоў* і *перазыўшчыкі* 'госці маладой, што едуць да яе ў дом маладога'.

Віцебскі арэал акрэсліваецца назвамі *падкняжы* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *панібрацця* 'тс', *тысяцкі* 'хросны бацька маладой або маладога', *дружка* 'знахар', намінацыямі выканаўцы стаўбавой песні (*стаўбавы, запявала, пачынальнік, начынальнік*). Усе гэтыя лексемы выходзяць таксама на Смаленшчыну. Арэал адпавядае віцебскай падгрупе гаворак [2: №72], віцебскаму пучку ізалекс [1: №46].

Ашмянска-барысаўскі арэал выдзяляецца паводле намінацый *закоснік* 'нежанаты брат маладой', *бальшанка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой'.

Па тэрмінах *бруснік* 'нежанаты брат (сябар) маладога' і *майстрыха* 'старшая каравайніца' вылучаецца мінскі арэал. Ён суадносіцца з цэнтральнай Міншчынай, якая акрэсліваецца некаторымі назвамі з лексікі жывёльнага свету [1: №25]. Арэал адпавядае цэнтральнаму гісторыка-этнаграфічнаму рэгіёну Беларусі [3: 152].

Панямонне акрэсліваюць такія намінацыі, як *нарачоны* 'хлопец на перадвясельным этапе', *нарачоная* 'дзяўчына на перадвясельным этапе', *дружбант* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *дружбантка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *сванька* 'замужняя жанчына з боку маладой або маладога' і 'незамужняя дзяўчына з боку маладога або маладой', *прыданыя, прыданкі* і *прыданікі* 'госці з боку маладога'. Арэал адпавядае гродзенска-баранавіцкай групе гаворак паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы і гісторыка-этнаграфічнаму рэгіёну Панямонне.

Выдзяляецца асобна паўднёвапанямонскі арэал. Яго акрэсліваюць лексемы *заводчык* 'нежанаты брат маладой', *пісар* 'асоба, якая дзеліць каравай' і *маршалак* 'мужчына, які садзіць каравай у печ'. Гэты арэал супадае таксама з вылучаным на падставе некаторых назваў з лексікі жывёльнага свету [1: №22].

Заходні арэал вылучаецца паводле лексем, што бытуюць у Панямонні і Заходнім Палессі. Гэта тэрміны *чашнік* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *брат* 'тс', *прыданка* 'замужняя жанчына пры маладой', *прасільнік* 'той, хто запрашае на вяселле', *стараста* 'госць з боку маладога, які вязе і сцеражэ гарэлку', *маршалак* і *маршалка* 'жанаты мужчына, які сватае нявесту', *пярэзвы*, *пярэзва* і *перазвяныя* 'госці з боку маладой, якія вязуць пасаг у дом маладога'. Арэал адпавядае заходнепалеска-панямонскаму пучку ізалекс [1: №38], а таксама гродзенска-баранавіцка-лунінецкаму пучку ізаглос [2: №13].

Палескі арэал (Заходняе і Усходняе Палессе) акрэсліваюць назвы *стараста* 'галоўны кіраўнік вяселля', *запітая* 'дзяўчына пасля заручын і да вяселля', *запарожжа*, *запарожцы* і *запарожанне* 'незапрошаныя на вяселле', *дружка* і *дружок* 'жанаты мужчына, які сватае нявесту', *пярэзвы*, *пярэзва*, *перазоў* і *перазвяныя* 'госці з боку маладой, якія едуць да яе ў дом маладога', намінацыі з коранем князь-/княж- для абазначэння нежанатага брата (сябра) маладога (*падкняжы, падкняжны, князь, князёк, княж, княжок, княжы*). Ён адпавядае сярэднебеларускім ізаглосам другой групы [2: №64], супадае таксама з палескімі ізаглосамі [1: №28].

Брэсцка-драгічынскі арэал вылучаецца паводле лексем *маладзец* 'малады', *маладуха* 'маладая', *падмалады* і *помалады* 'нежанаты брат (сябар) маладога'. Ён адпавядае камянецка-антопальска-дзвінскаму пучку ізаглос [2: №3], а таксама цэнтральна-заходняму Загароддзю [1: №36].

Пінска-мазырскі арэал акрэсліваецца тэрмінамі *маршалак* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *падстараста* і *падстарашчы* 'памочнік кіраўніка вяселля'. Ён суадносіцца з лунінецка-жыткавіцка-мазырскім пучком ізаглос [2: №23].

У паўднёва-ўсходнім арэале вылучаюцца тры мікраарэалы: мазырска-рэчыцка-кармянскі, бабруйска-гомельскі і магілёўска-гомельскі. Першы акрэсліваецца словамі *свяцілка* і *свяцільніца* 'незамужняя сястра маладога, адказная за свечкі', *пазываты* і *называты* 'той, хто запрашае на вяселле'. Бабруйска-гомельскімі ў адносінах тэрыторыі пашырэння з'яўляюцца тэрміны *баярка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *баярын* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *князь* 'кіраўнік вяселля'. У склад магілёўска-гомельскіх назваў уваходзяць словы *паднявесніца* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *паджанішнік* 'нежанаты брат (сябар) маладога', *вячэрнія* 'вячэрні поезд гасцей маладой у дом маладога (на Гомельшчыне) і 'госці з боку маладой, што перавозяць пасцель' (на Магілёўшчыне). Магілёўска-гомельскі лексічны арэал адпавядае гісторыка-этнаграфічнаму рэгіёну Падняпроўе [3: 152]. Увесь паўднёва-ўсходні арэал супадае ў межах з паўднёва-ўсходняй дыялектнай зонай [2: №76].

На падставе аднакаранёвых адзінак з тоесным або блізкім значэннем выдзяляюцца полацкі, паўночнапанямонскі, панямонска-слуцка-добрушскі і слуцка-мазырскі арэалы. Полацкі арэал акрэсліваецца назвамі з коранем малад-/маладз- (*падмалады, падмаладзяны, падмаладзенец*) для

абазначэння нежанатага брата (сябра) маладога. Паўночнапанямонскі арэал адасабляецца на аснове тэрмінаў *асістэнт* 'нежанаты брат (сябар) маладога' і *асістэнтка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой'. Панямонска-слуцка-добрушскі арэал акрэсліваюць найменні *дзядзя*, *дзядзька*, *дзядзечка* са значэннем 'нежанаты брат (сябар) маладога'. Слуцка-мазырскі арэал выдзяляецца на аснове намінацый *пасцельніцы* 'жанчыны, якія вязуць пасцель у дом маладога' і *пасцельнікі* 'хлопцы з боку маладой, якія вязуць пасцель у дом маладога'.

Намінацыі вясельных чыноў утвараюць і разарваныя арэалы. Адну групу сярод такіх намінацый складаюць назвы, якія ўжываюцца ў Падзвінні і на Палессі, другую – лексемы, што бытуюць ў Падзвінні і на ўсходняй Гомельшчыне. Да ліку першых адносяцца тэрміны з коранем князь-/княж- (*князь, князёк, княж, княжок, княжы, падкняжы, падкняжны*) для абазначэння нежанатага брата (сябра) маладога, назва *падмаладзы* 'тс', намінацыі з коранем зв-/зоў-/зыў- (*перазоў*, *перазыўшчыкі* і інш.) для маркіроўкі гасцей маладой, што едуць да яе ў дом маладога. Да тэрмінаў, пашыраных у Падзвінні і на ўсходняй Гомельшчыне, адносяцца: *баярка* 'незамужняя сястра (сяброўка) маладой', *баярын* 'нежанаты брат (сябар) маладога' і 'кіраўнік вяселля', *вячэрнікі* і *вячэрнія* 'вячэрні поезд гасцей нявесты ў дом жаніха'.

Выяўленыя таксама адзінкавыя намінацыі.

Параўнанне вылучаных арэалаў з вядомымі ўжо ў беларускай дыялекталогіі паказвае, што папярэдне акрэсленыя намі лексічныя арэалы ў асноўным адпавядаюць ранейшым падзелам, хаця некаторыя намінацыі вясельных чыноў утвараюць адметныя пакуль што мікраарэалы. Частка выяўленых дыялектна-тэрытарыяльных груп супадае і з падзелам на гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны.


1. Лексічныя ландшафты Беларусі: Жывёльны свет. – Мн., 1995. – 255 С.
2. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак: (кніга карт). – Мн., 1969.
3. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн., 1989. – 575 С.